плат (эти факторы способствуют росту привлекательности для белорусов эмиграции в Польшу); 5) миграционная политика Польши, облегчающая для белорусов миграцию в Польшу, как на постоянной, так и на временной основе.

Совокупным результатом действия этих факторов является резкий рост количества белорусов, имеющих вид на жительство в Польше, приближающегося к 100 тыс. человек, а также численности получивших разрешения на работу в этой стране. Только в январе—июне 2018 г. на заработки в Польшу, по данным министерства семьи, труда и соцзащиты этой страны, отправились 8495 белорусов (годом ранее — 6839 человек. Это более чем в 4 раза больше, чем по данным Департамента по гражданству и миграции МВД Республики Беларусь).

В настоящее время в Польше прорабатываются поправки к Закону об иностранцах, которые коснутся трудовых мигрантов из Армении, Беларуси, Грузии, Молдовы, России и Украины. Согласно им, трудовые мигранты, имеющие разрешения на проживание и работу, смогут через год после проживания перевезти к себе родственников, которые также смогут легально работать в Польше. Введение этих поправок на наш взгляд увеличит миграции и будет способствовать переходу временных трудовых миграций в категорию постоянных.

По данным Национального статистического комитета Республики Беларусь сальдо миграции между странами стало отрицательным только с 2015 г. Отметим, что отток населения даже по белорусским данным нарастает и вырос за три последних года более, чем в 2 раза.

Таким образом, настоящий момент характеризуется всплеском белорусско-польских миграций. Нарастание демографических проблем в обеих странах вызывает усиление конкурентной борьбы за дефицитные трудовые ресурсы. К сожалению, пока эту борьбу наша страна проигрывает, что требует усиление внимания к этой проблеме.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ЭТНІЧНЫХ МЕНШАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ

***Захаркевіч С. А.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*e-mail: stepanzakch@gmail.com*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь*

*У артыкуле прапанаваны падзел на гістарычныя і новыя этнічныя меншасці. Першыя — гэты тыя, якія рассяліліся на беларускіх землях да падзелаў Рэчы Паспалітай (яўрэі, татары, цыганы, рускія стараабрадцы, шатландцы). Новыя — якія з'явіліся вялікіх міграцый у Расійскай імперыі і СССР пад уплывам эканамічных працэсаў ці этнічных канфліктаў.*

*Асобная ўвага надаецца канструктывісцкім аспектам узнікнення часткі этнічных меншасцей Беларусі (рускія, палякі і украінцы).*

***Ключавыя словы:*** *этнічныя меншасці Беларусі; гістарычныя меншасці Беларусі; этнічная гісторыя Беларусі; міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі.*

Беларусь заўсёды ўяўляла сабой тэрыторыю дамінуючага існавання беларусаў. Аднак у іх этнічным ландшафце заўважнымі былі прадстаўнікі іншых культурных традыцый — этнічныя меншасці.

Пералік і склад этнічных меншасцей Беларусі неаднародны ў гістарычнай перспектыве і залежаў ад мноства фактараў. Умоўна можна вылучыць «гістарычныя» меншасці — тыя, якія з'явіліся на беларускіх землях да ўключэння іх у склад Расійскай імперыі, і «новыя» — што рассяліліся тут пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Крытэрыем менавіта такога падзелу служыць не храналагічны фактар, а хутчэй геаграфічны. Гістарычныя этнічныя менасці, як правіла, міграваліі з іншых дзяржаў ці палітычных фарміраванняў, а новыя з'яўляліся вынікам унутранных міграцый вялікіх імперый (Расійскай імперыі і СССР).

Да гістарычных меншасцей можна аднесці армян, яўрэяў, татараў, цыганоў, шатландцаў, рускіх стараабрадцаў і немцаў. Новыя меншасці Беларусі — азербайджанцы, малдаване, туркмены, грузіны, кітайцы, узбекі, казахі, арабы, чувашы, мардва, башкіры і інш., з'яўленне якіх пачалі фіксаваць перапісы XX ст., асабліва 1959, 1970, 1979, 1989, 1999 і 2009 гг.

Асобна трэба вылучыць групу этнічных меншасцей Беларусі, якая звязана з суседнімі дзяржавамі (Літва, Латвія, Польшча, Расія і Украіна). Вызначэнне гэтых меншасцей ускладнена некалькімі прычынамі: наяўнасць доўгай агульнай гісторыяй (Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай), кантактамі з «роднымі» краінамі, рознымі канцэпцыямі нацыяўтварэння, а таксама палітызацыяй працэса (фобіі сепаратызму, тэрытарыяльная цэласнасць і гістарычныя выпадкі страты тэрыторый).

Гістарычныя этнічныя меншасці з'явіліся на беларускіх землях некалькі стагоддзяў таму ў якасці бежанцаў ці па запрашэнню палітычных элітаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Негледзячы на важную эканамічную ролю ў некаторых сферах жыцця (яўрэі ў гандлі і пасрэдніцтве, армяне ў рамястве і гандлі з Усходам, татары — агародніцтве і фурманстве, шкоты — ваеннай справе і сеткавым маркетынгу), іх палітычны статус і культурны ўплыў быў невялікі. Частка з іх увогуле асімілявалася і знікла (армяне і шатландцы). Менавіта гістарычныя этнічныя меншасці сталі неад'емнай часткай беларускай карціны свету і ўспрымаюцца беларусамі як «свае», нават татары-мусульмане ці беспапоўцы-стараабрадцы. «Свойскасць» шмат у чым абумоўлена адсутнасцю «пагрозы» для беларусаў з-за нешматлікасці і гістарычна доўгага перыяду пражывання на Беларусі.

Новыя этнічныя меншасці з'явіліся вынікам імперскай палітыкі і эканомікі. Вялікая трансфармацыя краіны прывяла к значным унутранным міграцыйным хвалям. Вялікія будоўлі, моцная ўрбанізацыя, шырокія магчымасці моладзевай працоўнай міграцыі, адкрыццё і развіццё сярэдней прафесійнай і вышэйшай адукацыі прывялі к узнікненню новых этнічных супольнасцей у БССР. Да гэтага трэба дадаць таксама і ўнутранныя прычыны міграцыі з некаторых рэспублік СССР. Так, прычынай двухкратнага росту армянскай меншасці Беларусі па перапісу 1989 г. і трохкратнага — згодна з перапісам 1999 г. стаў землятрус 1988 г., які прынёс вялікія разбурэнні і ахвяры, а потым — канфлікт у Нагорным Карабаху (1987—1988 гг.; 1991—1994 гг.).

Першапачаткова для гэтых груп былі характэрныя змяшаныя шлюбы, знікненне этнічных адрозненняў. Аднак пасля распаду СССР у Беларусі пя-

тая частка насельніцтва аказала належнай да этнічных меншасцей. Этнічная сваеасаблівасць зноў стала падмуркам кансалідацыі новых этнічных меншасцей. Яны імкнуцца захоўваць сувязі з краінай-айчынай.

Асобнай увагі заслугоўваюць этнічныя меншасці, якія звязаныя з суседнімі для Беларусі дзяржавамі. Рускія, палякі і украінцы разам дасягаюць прыкладна 15 %! Праблема разумення феномена гэтых этнічных меншасцей ускладняецца шырокай распаўсюджанасцю тэорыі прымардыялізму. Мы не маем шырокавядомых гістарычных фактаў польскай рускай ці ўкраінскай міграцыі на беларускія землі. Гэта выклікае пытаніі і незразумеласць прычын з'яўлення тут сотняў тысяч палякаў, рускіх ці ўкраінцаў. Аднак калі адмовіцца ад прымардыялізму на карысць канструктывістскай тэрыі этнічнасці, то адразу становяцца зразумелымі крыніцы і шляхі ўзнікнення гэтых этнічных меншасцей.

Польская меншасць была сканструявана праз працяглы ўплыў каталіцкай царквы, якая доўгі час была правадніком польскай культуры, а таксама праз шматлікія інстытуты Другой Рэчы Паспалітай, у якую з 1921 па 1939 гг. уваходзілі заходнія беларускія землі. На сучасным этапе моцным рэсурсам, які падтрымоўвае гэты працэс з'яўляецца «картка паляка».

Руская меншасць пачала фарміравацца яшчэ падчас існавання Расійскай імперыі, калі для кар'еры беларусу трэба было «русіфікавацца». За савецкім часам гэты працэс узмацніўся урбанізацыяй, рэальнай міграцыяй у БССР працоўных рэсурсаў, а таксама дзякуючы палітыцы стварэння «савецкай нацыі» на аснове рускай этнічнасці.

Украінцы ў Беларусі фарміраваліся і рассяляліся ў асноўным на паўднёвых тэрыторыях. Гэта было звязана з памежным характарам гэтых зямель, уплывам СМІ, а таксама нацыянальнай украінскай адукацыяй, якая падчас Другой сусветнай вайны ахапіла паўднёвыя раёны Брэсцкай, Гомельскай, Пінскай і Палескай абласцей, якія ўвайшлі ў склад Рэйхскамісарыята Украіна. Беларускія тэрыторыі былі там аб'яднаны ў чатыры акругі — Васілевічскую, Ельскую, Мазырскую, Пінскую.

Такім чынам, пятая частка сучаснага беларускага грамадства належыць да этнічных меншасцей. Шляхі іх з'яўлення на Беларусі былі моцна адрозныя, што дазваляе па-рознаму іх разумець і ўспрымаць.

## ПРОБЛЕМА НЕЛЕГАЛЬНОЙ МИГРАЦИИ СРЕДИ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

***Калинин А. В.,*** *Республиканский институт высшей школы,*
*e-mail: icec.kalinin@gmail.com*
*ул. Московская, 15, 220007, Минск, Беларусь*

*Рассматривается проблема нелегальной миграции среди иностранных студентов, прибывающих на обучение в Республику Беларусь. Определена актуальность сферы экспорта белорусского образования, приводятся ссылки на соответствующие нормативно-правовые акты. Автором также проводится оценка масштабов проблемы и даются рекомендации по улучшению ситуации.*